Юрченко В.І. – [Вид. 2-е, доп. і перероб.] – К.: Каравела, 2008. – 351 с.
2. Гончаренко, С. У. Педагогічні дослідження : Методологічні поради молодим науковцям / С. У. Гончаренко. – Київ-Вінниця : ДОВ "Вінниця", 2008. – 278 с.
3. Єгорова, В. В. Інноваційні педагогічні технології в сучасному навчально-виховному процесі ВНЗ / В. В. Єгорова // Наукові записки [Текст] / [заг. редкол. : Брюховецький В. С. (відп. ред.) та ін.]. − К. : НаУКМА, 1998 − Т. 97: Педагогоічні, психологічні науки та соціальна робота / [редкол. : Гірник А. М. (голов. ред.) та ін.]. − 2009. С. 28−31.
4. Методика навчання і наукових досліджень у вищій школі : Навч. посібн. / С. У. Гончаренко, П. М. Олійник, В. К. Федорченко та ін.; За ред. С. У. Гончаренка, П. М. Олійника. – К. : Вища школа, 2003. – 323 с.
5. Плахотнік, О. Організаційна структура наукових досліджень в Україні / О. Плахотнік // Гуманізація навчально-виховного процесу [Текст] : наук.-метод. зб. / Слов'ян. держ. пед. ун-т ; [редкол. : В. І. Сипченко (відп. ред.) та ін.]. − Слов'янськ : СДПУ, 200 − Спецвип. 7, Ч. 2. − 2011.− С. 129 − 141.

УДК 32.001

## “ЦЭХАВАЯ” НОРМА: ДА ПЫТАННЯ ПРА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ УЗАЕМНАГА НАВЕДВАННЯ ЗАНЯТКАЎ У ВНУ

**В. У. Галубовіч**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт” (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле закранаецца праблема эфектыўнасці практыкі ўзаемнага наведвання заняткаў у вышэйшых навучальных установах.

Ключавыя словы: універсітэт, наведванне, занятак, эфектыўнасць.

## “ЦЕХОВАЯ” НОРМА: К ВОПРОСУ О ЭФФЕКТИВНОСТИ ВЗАИМНОГО ПОСЕЩЕНИЯ ЗАНЯТИЙ В ВУЗЕ

**В. В. Голубович**
УО “Гродненский государственный аграрный университет”
(Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье затрагивается проблема эффективности практики взаимного посещения занятий в высших учебных заведениях.

Ключевые слова: университет, посещение, занятие, эффективность.

## A “CORPORATION” STANDARD: TO THE QUESTION OF EFFECTIVENESS OF LESSON MUTUAL ATTENDANCE AT UNIVERSITY

**V. U. Halubovich**
EI “Grodno State Agrarian University” (Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article touches upon the problem of lesson mutual attendance practice effectiveness in higher educational establishments.

Key words: university, attendance, lesson, effectiveness.

Выходнай падставай для дадзенай рэплікі стала даволі цікавая знаходка ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гародні, дзе захоўваюцца ўрыўкавыя матэрыялы пра арганізацыю сельскагаспадарчай адукацыі ў Гарадзенскай губерні ў пачатку XX ст. Намі была звернута ўвага на цыркуляр



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

загадчыкам сельскагаспадарчых школ з Галоўнай управы земляробства і землекарыстання, які трапіў у Гародню летам 1914 г. [НГАБ. Ф. 361, воп. 1, спр. 32, арк. 71]. Дырэкцыя Дэпартамента земляробства настойліва рэкамендавала выкарыстанне досведу неназванай сельскагаспадарчай вучэльні, настаўнікі якой сталі практыкаваць узаемнае наведванне і абмеркаванне заняткаў, у тым ліку "*не выключаючы законанастаўніка і кіраўніка вучэльні*". Як вынікае з дакумента, пытанне аб "*узаемным наведванні настаўнікамі ўрокаў і практычных заняткаў*" з'яўлялася актуальным, больш таго, яно было прадстаўлена ў асобным дакладзе на з'ездзе па пытаннях сельскагаспадарчай адукацыі, які прайшоў у Маскве ў 1912 г. Удзельнікі з'езда пастанавілі, што наведванне належала арганізоўваць у кожнай навучальнай установе, і гэта павінна было стаць "*заўсёднай і рэгулярнай мерай*". У дакуменце, складзеным больш сто гадоў таму, гаворка ідзе пра "навацыю", якая з перспектывы нашага часу з'яўляецца банальнасцю, але так справа выгляда толькі на першы погляд.

Кожны выкладчык вышэйшай навучальнай установы абавязаны здаць самы галоўны "іспыт" педагога на права выкладаць: правесці адкрыты занятак у прысутнасці камісіі, у тым ліку калег. Такія "пастановачныя" мерапрыемствы вельмі падобныя да абавязковых узаемных наведванняў заняткаў у межах асобных кафедр і факультэтаў на працягу навучальнага года. Практыка ўзаемнага наведвання ў значнай ступені з'яўляецца фармальнай, і гэта ўсе ведаюць. Сама ж прысутнасць калег у студэнцкай аўдыторыі звычайна падвышае градус напругі і ў большасці выпадкаў успрымаецца як праява недаверу. Чаму так адбываецца, пытанне асобнае. Студэнцкая аўдыторыя звычайна трактуецца як майстэрня, дзе цэхавы майстар транслюе свае веды, а не здзяйсняе адкрыцці. Для апошніх ёсць лабараторыя, працоўны стол і адпаведныя навуковыя прэзентацыі на канферэнцыях. Што можа зацікавіць прысутных на лекцыі калег пры выкладанні матэрыялу, які павінен адпавядаць пэўнаму навучальнаму стандарту? Несумненна, інтэрпрэтацыя, але яна далёка не абавязковы кампанент, бо ёсць гатовыя схемы, зацверджаныя праграмай і тыпавымі падручнікамі. Тут варта звярнуць увагу на тое, што адзін з галоўных пунктаў, які фіксуецца пры ўзаемным наведванні – адзнака таго, на колькі выкладанне адпавядае шаблону, так званым "патрабаванням вышэйшай школы". Іншымі словамі, па сутнасці ацэньваецца не арыгінальнасць, а ўменне быць як іншыя: прыдатным, так сказаць, сярэднім цэхавым майстрам, змест працы якога – на другім месцы пасля зададзенай формы. Між тым, вышэйшая школа не павінна скатвацца толькі да ўзроўню рэтранслятара. Вучыць студэнтаў дае права не толькі веданне прадмета, але і здольнасць карыстацца ведамі дзеля атрымання новых ведаў. Вучыць – тут сінонім паняцця вучыцца самому, быць навукоўцам, наватарам і разбуральнікам стэрэатыпаў. Чаму можа навучыць той, хто сам не ў стане мысліць творча? Калі ж адкінуць пафас, то варта заўважыць, што ўзаемнае наведванне – больш форма кантролю, і толькі ў мінімальным аб'ёме сродак абмену вопытам. Апошняе датычыцца пераважна камунікацыі паміж супрацоўнікамі розных генерацый, бо складана сабе ўявіць, каб выкладчыкі, якія дзесяцігоддзі працуюць на адным факультэце, не ведалі "манеру" выкладання сваіх калег і рэгулярна абмяркоўвалі чужыя і асабліва свае плюсы і, што зусім недапушчальна, "мінусы".

Нарэшце, што можа даць наведванне калег, якія не з’яўляюцца спецыялістамі па дысцыпліне. Іх заўвагі могуць мець сур’ёзны характар хіба пры адзнаке методыкі выкладання, але ніяк не па зместу інфармацыі. Але і вартыя ўвагі метадычныя парады дадазена фармуляваць далёка не кожнаму, хто па розных прычынах трапляе за кафедру.

Такім чынам, узнятая праблема ніяк не можа быць другаснай для педагагічнага персаналу ўніверсітэта. Наведванне заняткаў калег з’яўляецца вельмі важнай абавязковай часткай працы выкладчыка вышэйшай школы, але сам падыход да гэтага мерапрыемства варта пераасэнсоўваць. У адваротным выпадку пазітыўны змест яго па закону нашага жыцця ператворыцца ў фармальнасць.

УДК378:37.015.31.

## СОЦИАЛЬНО-ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ФОРМИРОВАНИЯ ЛИЧНОСТИ СТУДЕНТА В СОВРЕМЕННОМ ВУЗЕ

**В. М. Горошко, В. И. Невдах, М. В. Скуловец**
Пинский филиал УО «БГСХА», Пинский филиал УО «ВГАВМ» (Республика Беларусь, 225750, Брестская область, Пинский район, д. Галево, ул. Юная, 7; e-mail: vgavm-pinsk@mail.ru)

Аннотация. В статье рассматривается роль личности студента в формировании его человеческого капитала как будущего специалиста.
Ключевые слова: человеческий капитал, студент, личность, образовательный процесс, специалист.

## SOCIAL AND PSYCHOLOGICAL ASPECTS OF FORMATION OF THE IDENTITY OF THE STUDENT IN MODERN HIGHER EDUCATION INSTITUTION

**V. M. Goroshko, V. I. Nevdakh, M. V. Skulovets**
EI "BGSHA" Pinsk branch, EI "VGAVM" Pinsk branch (Republic of Belarus, 225750, Brest region, Pinsk district, of Galevo, Yunaya st., 7; e-mail: vgavm-pinsk@mail.ru)

Summary. The article discusses the role of the individual student in the development of human capital as a future specialist.
Key words: human capital, student identity, educational process, specialist.

В связи с возрастающей ролью человеческого капитала в устойчивом социально-экономическом развитии Беларуси, на ближайшую и далекую перспективу, перед системой высшего образования поставлена весьма важная стратегическая цель. Высшая школа, как важнейший социальный институт, должна перейти к 2021-2030 гг. к новой образовательной парадигме, главной целью которой является «не обучение, а учение; не усвоение готовых знаний, а способность самостоятельного получения, накопления и переработки их; создания новых технологий и внедрения в практику…» [1]. При этом, основной задачей в данный период является формирование личности с



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ